[6] Чарнаглазава Р. У кожнага – свая жыццёвая праўда... // Звязда. 1993. 3 ліпеня. С.2.
[7] Там жа.
[8] Жумарь С.В. Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны (на материалах белорусскоязычных изданий): Дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1995. С.83.
[9] Сенька М. Дасць Бог, і Беларусь будзе квітнеючай краінай // Літаратура і мастацтва. 1993. 29 мая. С.14.
[10] Навумчык Ю. Падтрымліваць беларускае жыццё ў Амерыцы з кожным годам становіцца цяжэй // Звязда. 1993. 6 ліпеня. С.2.
[11] Гл.: Карачун У. Народ памятае, хто быў ахвярай, а хто катам // Звязда. 1993. 28 жніўня. С.3.
[12] Дуброўскі І. Паклаўшы руку на Біблію // Літаратура і мастацтва. 1994. 6 мая. С.5, 13.
[13] Крукоўскі М. "Партызаны, партызаны – беларускія сыны..." // Літаратура і мастацтва. 1994. 24 чэрвеня. С. 5, 12.
[14] Алексиевич С. Нас так долго учили любить человека с ружьем // Известия. 1996. 29 февраля. С.5.
[15] Алексіевіч С. Я – не писатель катастроф. Просто жизнь вокруг нас катастрофична до бессмысленности // Народная газета. 1996. 13 красавіка. С.7.
[16] Жумарь С.В. Назв. праца. С.102.

*А.І.САЛАЎЁЎ*

## КІБЕРНЕТЫЧНЫ ПАДЫХОД У ДАСЛЕДАВАННІ ГЕЙТКІПЕРСТВА

Праблема дыфузіі і распаўсюджвання інфармацыі ў якасці адметных элементаў сістэмы масавай камунікацыі ў грамадстве ўяўляе сабой адзін з важнейшых бакоў у гэтай сістэме. І тут, напэўна, не абысціся без разважанняў наконт гейткіпера і яго ролі ў адборы інфармацыйных паведамленняў для распаўсюджвання і масавага тыражыравання.

Паняцце гейткіпера ў дачыненні да мас-камунікацыйнага даследавання было ўведзена некалькі дзесяткаў гадоў таму амерыканскімі вучонымі. Літаральны пераклад англійскага слова gatekeeper азначае "брамнік". У традыцыйным разуменні "брамнік" адчыняе і зачыняе вароты. Гейткіпер таксама валодае своеасаблівымі "варотамі", якія ён то адчыняе, калі "прапускае" нейкую інфармацыю для публікацыі, для перадачы ў радыё- ці тэлеэфір, то зачыняе, калі інфармацыйныя паведамленні не прызначаны для масавага чытача, слухача ці гледача і трапляюць у нейкі сімвалічны кошык для смецця.

Хто ён такі, гэты функцыянер з моцнай пазіцыяй, калі ён не цэнзар?.. А ён *не цэнзар*, таму што мы даследуем сістэму функцыяніравання масавай камунікацыі ў свабодным, дэмакратычным грамадстве. І хоць гісторыя даследавання гейткіпера ўжо набліжаецца да паўвекавога юбілею, прадмет вывучэння, як і раней, настолькі прыцягальны, што ў шэрагу значных навуковых і сацыялагічных часопісаў па масавай камунікацыі (маецца на ўвазе перш за ўсё далёкае замежжа) штогод публікуецца па гейткіперству вялікая колькасць рознааспектных навуковых трактатаў.

Традыцыйнае даследаванне праблемы гейткіпера звычайна вылучае тры асноўныя напрамкі вывучэння: а) праз індывідуалісцкую ўстаноўку; б) праз інстытуцыянальную ці бюракратычную залежнасць; в) з пункту гледжання кібернетычнага падыходу.

Апошні спосаб даследавання найбольш цікавы. Вучоныя, якія распрацавалі метадалогію кібернетычнага аналізу змяненняў у комплексных сацыяльных арганізацыях, зрабілі пэўнае нечаканае адкрыццё па праблематыцы грамадскай камунікацыі: звяртанне да кібернетычнага падыходу павінна прадугледжваць уменне і здольнасць трымаць пульс на працэсах хутказменлівых абставін знешняга асяроддзя.

Гэтая канцэпцыя разглядае інфармацыйны адбор як *нейкую стабілізуючую схему дзеянняў*, з дапамогай якой група журналістаў праз адпаведныя акцыі апрацоўкі рэагуе на "сыры" інфармацыйны матэрыял.

Лагічны аналіз селекцыі паведамленняў фактычна вылучае некалькі састаўных частак цэласнага працэсу.

На першым этапе інфармацыйнага адбору зацвярджаюцца фармальныя рамкі, фактычныя асновы ўжывання матэрыялаў: *штодзённа "запатрабуецца" дастаткова абмежаваная, вызначаная колькасць слоў ці, хутчэй, паведамленняў, аб'ём якіх не залежыць ад агульнай колькасці адзінак інфармацыі.*

У гэтым выпадку можна гаварыць аб своеасаблівым інфармацыйным лиміце, "рэгламентаваным" абмежаванні выкарыстання інфармацыі да ўзроўню, які можа быць не ніжэй, але і не вышэй устаноўленай планкі.

Гейткіпер ні пры якім сваім жаданні не мае права выйсці з "пракрустава ложа", пад якое ён, штодзённа знемагаючы ад усялякіх скарачэнняў, павінен падвесці і прыстасаваць строга патрэбную колькасць газетных радкоў, мінут інфарміравання ў радыёэфіры ці на тэлеэкране.

На другім этапе *звяртаецца ўвага на праходжанне матэрыялу, на шлях руху паведамлення разам з працэсам яго карэкціравання і шматразовага скарачэння.* На гэтай стадыі апрацоўкі інфармацыя праходзіць праз рукі некалькіх службовых асоб камунікацыйнай "бюракратыі". Праўда, не кожны з іх надзелены функцыямі гейткіпера і можа "выносіць канчатковы вердыкт". Некаторыя з іх усяго толькі "прапускаюць" любую інфармацыю.

На трэцім этапе ў *дзеянне ўступаюць "унутрыцэхавыя" камітэты і аддзелы, якія выконваюць ролю своеасаблівых сэнсараў.* Яны прымаюць паведамленні, вылучаюць іх з нейкага шэрагу фактараў, робячы сапраўды маніторынгавы аналіз.

Гэтыя фармальныя структуры дапаўняюцца наборам такіх каналаў, як тэлефонныя паведамленні кліентаў, прадстаўнікоў розных урадавых службаў, з дапамогай якіх адбываецца значная падтрымка сувязі паміж сродкам камунікацыі і знешнім асяроддзем.

Калі працэс адбору прадставіць як нейкі закончаны ланцужок праходжання інфармацыі аднаго дня (для штодзённага выдання, напрыклад) ці аднаго тыдня (штотыднёвага бюлетэня або дайджэста), то атрымаецца своеасаблівы прагляд гейткіпераўскай дзейнасці, дзе суадносяцца як унутраныя, так і знешнія арганізатарскія фактары. Гэта карэляцыя сама па сабе бывае патрэбнай для таго, каб можна было больш дакладна і вызначана выразіць уплыў гэтых фактараў на апрацоўку навін.

Самыя простыя падлікі паказваюць, што кожная газета штодня выдае строгую колькасць публікацый, якой практычна заўсёды прытрымліваецца. Толькі ў некаторых выпадках дапускаюцца адхіленні ад нормы, якія могуць растлумачвацца чыста "вытворчымі" інтарэсамі.

Звычайна штодзённы аб'ём інфармацыйнай часткі газеты вар'іруецца ў залежнасці ад дзвюх асноўных прычын: па-першае, *з-за наяўнасці інфармацыі лакальнага характару* і, па-другое, *з-за ўстаноўленых прапарцыянальных суадносін паміж артыкуламі розных аддзелаў*, што фактычна вызначаецца ў выглядзе працэнтнай долі, якую кожная газета адводзіць міжнародным, нацыянальным і лакальным паведамленням.

Гэта мадэль дапаўняецца яшчэ вынікам даследавання, а менавіта: *спосаб дзеяння журналіста як гейткіпера могуць вызначыць хутчэй знешнія інстытуцыянальныя рамкі, чым яго асабісты псіхалагічны стан.* Акрамя таго, гэта мадэль дае магчымасць больш дакладна зразумець уздзеянне неапрацаваных інфармацыйных матэрыялаў, велічыню сеткі кліентуры і значэнне ўплыву патрэб кліентаў на апрацоўку адпаведных паведамленняў.

Красамоўным пацверджаннем сказанаму прадстаўляецца аналіз планавых і экстранных выпускаў навін расійскімі каналамі ГРТ, НТБ і "Расія" аб падзеях, звязаных з захопам тэрарыстамі раённай бальніцы ў г.Будзёнаўску 14 чэрвеня 1995 г. Вось некаторыя факты развіцця гэтых падзей, якія прыводзяцца ў храналагічнай паслядоўнасці.

У першыя тры дні з часу захопу заложнікаў асвятленне падзей ішло сумбурна, выпускі яўна грашылі тым, што часта выходзілі па суседству з навінамі, якія змястоўна выключалі адна адну. Спробы першага аналізу падзей уяўлялі сабой набор версій ці дагадак. Практычна ўсе вядучыя тэленавін трох каналаў здаваліся разгубленымі і не ведалі, як ім абысціся з інфармацыяй, якой яны валодалі "да гэтага часу". Мітусня некаторых вядучых перад камерамі наганяла паніку на гледачоў. Дарэчы, самымі бездапаможнымі здаваліся вядучыя канала ГРТ – менш свабодныя, чым іх калегі па іншых каналах, і больш залежныя ад знешніх інстытуцыянальных рамак, азначаных гейткіперамі, якія займаюць вельмі ўплывовыя пазіцыі ў іерархіі астанкінскай тэлевізійнай "кухні".

Наступныя тры дні да моманту вызвалення асноўнай групы заложнікаў, 19 чэрвеня, выявілі значныя разыходжанні з той карцінай, якая прадстаўлялася да гэтага. З 17 чэрвеня на ўсю моц запрацаваў "нярвовы цэнтр" перагаворнага працэсу, якім стаў рабочы кабінет тагачаснага расійскага прэм'ера В.С.Чарнамырдзіна. Сам факт устаноўкі тэлекамер перад сталом кіраўніка ўрада аўтаматычна замацаваў новае і вельмі манеўранае інстытуцыянальнае асяроддзе і стварыў структуру дзейсных "гейткіпераў", якія сталі аказваць значны ўплыў на перадачу інфармацыі ў тэлеэфір.

Пры гэтым будзе нялішне ўказаць на адну вельмі паказальную недарэчнасць у тэлемантажы перадачы вячэрняга выпуску навін на канале ГРТ 17 чэрвеня. Памылка, якая мела выключна спарадычны характар, выразілася ў тым, што на экране паміж двума сюжэтамі прамільгнуў незразумелы ўрывак каментарыя даўжынёй усяго 4-5 секунд. Тэхнічны ляпсус, які тычыўся "прарыву" некалькіх кадраў сюжэта з прыблізна вызначанай тэмай "забракаванага" і скасаванага каментарыя, сведчыў усяго толькі аб аператыўнай, эфектыўнай і беспамылковай працы гейткіпераў.

Абрывак фразы, якая пранікла ў эфір, літаральна ўказваў: "...аналізуюць маральны воблік главара тэрарыстаў..." Добра арыентуючыся ў знешніх абставінах і ў сваіх назіраннях, вопытны гейткіпер, відавочна, разумеў, што такі адзіны востры "аналіз" асобы кіраўніка тэрарыстычнай групоўкі можа па вядомай псіхалагічнай прычыне закрэсліць з такімі цяжкасцямі дасягнутую дамоўленасць аб пачатку тэлефонных перамоў паміж Віктарам Чарнамырдзіным і Шамілем Басаевым.

Факт палітычнай мэтазгоднасці, якая ўлічвае *ўзаемасувязь, неабходнасць узаемаадносін* тэхнічных, прававых, маральных і іншых магчымасцей, якімі валодае гейткіпер, з аднаго боку, і фактары дынамічна зменлівага знешняга асяроддзя, з другога боку, вельмі яскрава на дадзеным прыкладзе тлумачыць сутнасць кібернетычнай мадэлі ў дзеянні.

Такім чынам, на аснове аналізу нават прыведзеных прыкладаў можна зрабіць некаторыя заключэнні па выніках усяго даследавання. Па-першае, дасканалае вывучэнне праблемы гейткіперства даказвае, наколькі глыбіннымі і цяжка прадказальнымі могуць быць каўзальныя сувязі, якія забяспечваюць адэкватную рэакцыю ў ланцугу кібернетычнай мадэлі. Па-другое, кібернетычная ўстаноўка выяўляе нейкі схаваны тып *дынамічных сувязей кантролю*, які ажыццяўляецца нефармальнай і скрытна існуючай структурай "сэнсараў". *Сэнсарныя цэнтры* ў сістэмах сваіх бюракратычных арганізацый і інфармацыйных сетак – гэта інстытуты з дастаткова шырокімі паўнамоцтвамі. Патрэцяе, кібернетычная мадэль здольная, акрамя іншага, даволі дакладна прагназаваць паводзіны пэўнай арганізацыі і ў цэлым служыць у якасці нейтральнага, міжкультурнага рабочага метаду. Яна таксама можа дапамагаць атрымаць карысныя ўяўленні аб такіх важных велічынях, як змястоўная структура выпушчанага матэрыялу, суадносіны розных паведамленняў, працоўная дзейнасць журналіста ў нармальных абставінах і крытычных сітуацыях.